нец, плач, абрад) ствараецца з яе жанравай атрыбутыкай: сімфанічная паэма «Дыялект», п'есы для фартэпіяна «Вясёлыя гульні», «Жарты», для нар. аркестра «Народныя гульні», «Песня», «Вежа», «Мсціслаў» з 5-й сімфоніі «Памяць зямлі». У творах, у якіх нар. песня з'яўляецца зыходнай, характэрна прапрацоўка ўсіх бакоў фалькл. першакрыніцы (мелас, рытм, форма, жанр, вобраз) з сінтэзаваннем іх з інш. фалькл. інтанацыямі з інш. песень ці з аўтарскім матэрыялам: п'есы для аркестра бел. нар. інструментаў «Бульба», «Юрачка», «Крыжачок», «Лянок», «Прыпеўка», для баяна «Вяснянка», «Да зязюлькі», для цымбалаў і фартэпіяна «Матыў «Бульбы» і ансамбля цымбалістаў «Пастушок» (выкарыстаны інтанацыі песні «Чаму ж мне не пець»); вакальна-харэаграфічная кампазіцыя «З народных скарбаў» (выкарыстаны песні «Ой, гукнула сыраежка», «Пайду, пайду, Ясю мілы») і інш. У сваіх творах, у т.л. буйных, стварае абагулены вобраз чалавека з народа з яго псіхалогіяй і мудрасцю [балет «Страсці» («Рагнеда»), 5-я сімфонія «Памяць зямлі», музыка для спектакляў, у т.л. «Пінская шляхта» і інш.].

*Літ.*: А л а д о в а Р. Андрей Мдивани. Мн., 1980; Т у р б і н а Л. Метафарычны, як проза паэта, наскрозь! // Беларусь. 1995. № 11.

*Т. Г. Мдывані.*

**«МЕ́ДНЫ ЛОБ»**, сюжэт *чарадзейных казак* СУС 302, у якіх цэнтральным персанажам з'яўляецца чарадзейны памочнік героя. Ім мог быць Медны Лоб, Булат і Пілач — добрыя моладцы. Іван-царэвіч выкупляе памочніка, вызваляе яго ад пакут, за што апошні яму верна служыць. Медны Лоб дапамагае царэвічу ажаніцца з Яленай, вызваляе Ялену з Іванам ад Кашчэя, а потым суправаджае іх да Іванавых бацькоў. У дарозе, калі яны адпачываюць, тройчы прылятаюць галубы, якія гавораць пра пасткі, што рыхтуе Іванава маці, каб знішчыць царэвіча і яго жонку. Усё гэта чуе чарадзейны памочнік і выратоўвае маладых: вылівае на падлогу атручаны чай і стравы, папярэджвае, каб не кладліся ў ложак, бо там схаваны нажы. За тое, што Медны Лоб падслухаў размову галубоў, ён ператвараецца ў камень. Праз год у Івана і Ялены нараджаецца хлопчык. З яго мізінца яны ўзялі кроплю крыві, памазалі ёю камень, які тут жа разваліўся і з яго выйшаў іх памочнік. Героям казак гэтага сюжэтнага тыпу ўласціва вернасць, удзячнасць, самаахвярнасць.

*Літ.*: Р о м а н о в Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 6. Сказки. Могилев, 1901.

*К. П. Кабашнікаў.*

**МЕ́ЕР** Андрэй Казіміравіч (1742—1807), эканаміст, батанік. Паходзіў з Саксоніі. Член Вольнага эканамічнага таварыства і Вольнага расійскага сходу пры Маскоўскім універсітэце. Як аграном паходнай канцылярыі Р.Пацёмкіна склаў у 1785—86 «Апісанне Крычаўскага графства або былога староства» Магілёўскай губерні, апублікаванае са скарачэннямі Е.Раманавым у зборніку «Магілёўская даўніна» (вып. 2, 1901). У гэтым самым раннім этнаграфічным апісанні нар. побыту і культуры беларусаў упершыню прыведзены лаканічныя звесткі пра святкаванне Купалля (змешчана купальская песня з раскрыццём абраду) і Юр'я, што сведчыць пра непарыўную сувязь міфічных паданняў беларусаў ад старажытных часоў да часу напісання працы. Рукапіс зберагаецца ў архіве Казанскага універсітэта (Расія).

*І. У. Саламевіч.*

**МЕ́ЖЫ**, ч э р н е ц ь, фаза Месяца, калі начное свяціла на працягу некалькіх дзён нябачнае ў небе; няўлоўная мяжа паміж «старым» і «маладым» Месяцам. Продкі негатыўна ставіліся да М., бо верылі, што гэты момант, калі Бог не глядзіць на зямлю ніводным вокам (у нар. асяроддзі Месяц і Сонца лічылі вачамі Бога), спрыяе нячыстай сіле тварыць свае «цёмныя» справы; Месяц вяртаецца з «таго» свету — свету памерлых. Меркавалі, што адсутнасць свяціла ў начным небе (адна з палескіх назваў — «пустыя дні») можа справакаваць «пустэчу» ў жыцці і любой сферы гаспадарчай дзейнасці чалавека. У нар. асяроддзі існавала нямала прадказанняў і папераджальных правіл: чалавек ці жывёла, зачатыя ў М., не будуць жыць доўга; чалавек, які нарадзіўся на М., ніколі не народзіць дзіця (будзе такім жа «пустым», як месяц у гэты час) і рана аўдавее; кураняты, вылупленыя на М., будуць няўдалымі. На М. не спраўлялі Вяселле: засцерагаліся, каб маладыя не засталіся бяздзетнымі. У такі час не вадзілі карову на злучку, не саджалі квахтуху на яйкі, не сеялі (лічылі, што каласы будуць «пустымі»). Меркавалася, што адсутнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Месяца на небе, — спрыяльны час для пасадкі бульбы (параўноўвалі з пахаваннем), пасынкавання памідораў, падразання дрэў і кустарнікаў, знішчэння пустазелля. Выконвалі магічныя дзеянні, скіраваныя на знішчэнне скураных захворванняў (бародавак, мазалёў, лішаёў). Асабліва цудадзейным у такой справе быў гарох, украдзены з трох палёў на М. і абмалочаны на Раство. Бралі столькі гарошын, колькі было бародавак, праводзілі імі па скуры і спальвалі ў печы.

*Літ.*: Гл. да арт. *Поўня.*

*А. В. Катовіч.*

**МЕЛАДРА́МА** (ад грэч. melos песня, мелодыя + драма), п'еса, якой уласцівы дынамізм і вастрыня, займальнасць інтрыгі, павышаная эмацыянальнасць, патэтыка, узбуйненасць, рэзкае процістаўленне дабра і зла, гіпербалізаваны паказ страсцей, адкрытая маральна-дыдактычная тэндэнцыйнасць; жанр драматургіі. Узнікла ў сярэдзіне 18 ст. ў Францыі. Разлічана на ўспрыманне самага шырокага, у т.л. і тэатральна непадрыхтаванага гледача. Карыстаецца поспехам у нар. тэатры. На Беларусі развівалася з пачатку 20 ст. Жанр М. ці асобныя яго элементы выкарыстоўвалі К.Каганец («У іншым шчасці няшчасце схавана», нясконачаны гістарычны твор «Сын Даніла»), М.Гарэцкі («Атрута», «Салдат і яго жонка»), Л.Родзевіч («Блуднікі», «Пакрыўджаныя»), М.Чарот («На Купалле»; напісана на фалькл. матэрыяле), В.Гарбацэвіч («Чырвоныя кветкі Беларусі»), У.Галубок («Апошняе спатканне», «Бязвінная кроў», «Праменьчык шчасця», «Ганка», «Бязродны», «Белы вянок», «Пан Сурынта», «Плытагоны» і інш.), якія ў сваіх творах увасаблялі пераважна простых людзей, іх складаны, абвострана драматычны лёс, паказвалі нар. побыт. Драматургічныя прыёмы М. выкарыстоўваліся ў фалькл. тэатры (сцэна Ірада і Рахіль, якая беспаспяхова просіць выратаваць жыццё свайго дзіцяці, у батлеечным прадстаўленні «Цар Ірад»; сцэна пакарання смерцю сына Максіміляна Адольфа ў нар. драме «Цар Максімілян» і інш.).

*Літ.*: Семяновіч А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961; Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма. Кн. 1. Мн., 1969; Пятрова Л. Рамантыкі пранікнёнае свята: Бел. драматургія 20—30-х гг. Мн., 1987; Карабанава Л.В. Драматургія Уладзіслава Галубка. Мн., 1982; Лаўшук С. Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пачатак 30-х гг.). Мн., 1984.

*А. В. Сабалеўскі.*

**МЕ́ЛАС** (ад грэч. melos песня), абагульненае паняцце меладычнага, песеннага пачатку ў музыцы. У сучасную рас. і бел. музычную тэрміналогію ўведзены ў 1910-я г. Б.Асаф'евым.



*І. П. Мележ.*

**МЕ́ЛЕЖ** Іван Паўлавіч (8.2.1921, в. Глінішча Хойніцкага р-на — 9.8.1976), пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі (1972). Літаратурная прэмія імя Я.Коласа 1962, Ленінская прэмія 1972, Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1976. Скончыў БДУ (1975). Маці М., паводле яго слоў, «любіла спяваць свае «палескія песні». Любімую песню М. «Шумяць вербы ў канцы грэблі» слухае Ганна Чарнушка, галоўная гераіня трылогіі «Палеская хроніка». У дзённіках і запісных кніжках М. запісваў прыказкі, асобныя трапныя выразы, апісваў сюжэты нар. паданняў, анекдотаў, смешных пабытавых гісторый, цікавых дыялогаў. «Жывая мова народа, — пісаў М., — гэта крыніца, якая ўсё жыццё шчодра давала пісьменнікам моўныя вобразы, лексічныя формулы, звароты». Лічыў, што скарбніцу нар. мудрасці нельга выкарыстоўваць пасіўна, бо ў гэтым выпадку яна губляе сваю натуральнасць і універсальнасць. «Палеская хроніка» — эпас нар. жыцця, у ёй выяўлены фалькл.-міфалагічныя асновы бел. гісторыі, паказаны архітыповыя глыбіні нац. характару. Замілаванне да вобразаў роднага краю, паэтызацыя нар. звычаяў, захопленае апісанне паляшуцкіх характараў было жывой крыніцай велічнай задумы кнігі, «героем якой быў бы народ». У трылогіі адлюстравалася ў ператтвораным выглядзе міфапаэтычная традыцыя, у аснове якой ляжала старажытнае ўяўленне беларусаў пра ўзнікненне жыцця на зямлі і развіццё свету як паўтарэння даўніх рытуальных цыклаў. У гэтым творы пануе стыхія нар. песеннай культуры: лірычнай, каляндарна-абрадавай, жартоўнай, вясельнай і інш. Матывы нар. песні гучаць, пачынаючы з эпіграфа («Бацьку, маці, роднай зямлі»), як бы перанятага з велічальнага цыкла, які выконваецца на Каляды і на Вялікдзень, і заканчваючы найменшай адзінкай твора — жывым нар. словам. Легенда, песня, казка, анекдот, показка, прымаўка, мудраслоўе не проста адзін з мастацкіх прыёмаў, а атмасфера жыццядзейнас-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ